**ДАВЕДКІ ДЛЯ НАСТАЎНІКАЎ, 8 клас 2025-2026 н.г.**

| **Заданні** | **1** | **2** | **3** | **4** | **5** | **6** | **7** | **8** | **9** | **10** | **Усяго** |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| **Балы** | **5** | **5** | **5** | **5** | **4** | **10** | **6** | **5** | **5** | **5** | **55** |

**Заданне 1.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Слова** | **Фанетычныя з'ява** |
|---|---|
| Смех | Суседняя мяккасць (асіміляцыя па мяккасці) |
| Параход | Аглушэнне |
| Касьба | Азванчэнне |
| Перапісчык | Прыпадабненне свісцячага да шыпячага |
| Дзядуля | Дзеканне |

**Заданне 2.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Пачаўся свет – ласкавы і пакорны.
А што было, скажыце мне, да іх
У заінелай з нелюбі прасторы?

Як грэліся б ад позіркаў цяжкіх
Мужчыны у сваім мужчынскім горы,
Калі б **цябе** не выснілі вякі – *Вінавальны скл.*
**Цябе**, што гэтак шчодра ўсіх адорыць. *Вінавальны скл.*

Прыйшла **ты** – кветкі выраслі ля хат, *Назоўны скл.*
І гнёзды нараджалі птушанят,
І цёпла стала ўсюды, нібы ў леце.

Мужчына усміхнуўся сам **сабе,** *Давальны скл.*
Бо зразумеў, самотны, – за **цябе** *Вінавальны скл.*
Няма нічога ласкавей на свеце!

**Заданне 3.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Паняцце на рускай мове** | **Адпаведнік на беларускай мове** |
|---|---|
| По обе стороны чего-либо | Абапал |
| Вербное воскресенье | Вербніца |
| В прошлом году | Летась |
| Коллективная помощь, работа сообща | Талака |
| Летучая мышь | Кажан |

**Заданне 4.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| *Марфемная будова* | *Слова* |
|---|---|
| Корань, суфікс, канчатак | анатом-і-я, лек-ав-ы |
| Корань, суфікс, нулявы канчатак | аптэк-ар-□, ардынат-ар-□ |
| Прыстаўка, корань, суфікс, суфікс, суфікс | за-жы-в-і-ць, за-гіпс-ав-а-ць |
| Корань, суфікс, суфікс | хірург-ічн-а, бал-юч-а |
| Корань, суфікс, суфікс, канчатак | медыц-ын-ск-і, лек-ар-ск-і |

**Заданне 5.**

*Максімальная колькасць балаў – 4.*

| *Слова* | *Слова(ы) ад якога ўтвораны* | *Спосаб утварэння* |
|---|---|---|
| урасцяжку | расцяжк-(а) | Прыставачна-суфіксальны |
| узмежжа | мяж-(а) | Прыставачна-бяссуфіксны (прыставачна-нульсуфіксальны) |
| футбаліст | футбол-(Ø) | Суфіксальны |
| фізпадрыхтоўка | фізічн-(ая) падрыхтоўк-(а) | Абрэвіяцыя (складана-скарочанае слова) |

**Заданне 6.**

*Максімальная колькасць балаў – 10.*

За кожную памылку перакладу (лесічную або граматычную) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,2 бала, за кожную памылку ў афармленні (арфаграфічную або пунктуацыйную) – 0,1 бал. Калі работа выканана, хоць і з памылкамі, то 0 (нуль) балаў не ставім.

*Прыкладны пераклад.*

Ф.М. Дастаеўскі і Дастоева

Дастоева – гэта вёска Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Яна вядома ўсім аматарам і знаўцам рускай літаратуры тым, што тут размяшчаўся маёнтак (размяшчалася сядзіба) продкаў вялікага рускага пісьменніка Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага. У мясцовай школе адкрыты Народны літаратурна-краязнаўчы музей імя Фёдара Дастаеўскага, дзе ў фондах захоўваюцца ўнікальныя прадметы. У 1996 годзе ў двары школы ўсталяваны помнік Ф.Дастаеўскаму. Дакладна вядома, што сам пісьменнік ніколі не быў у Дастоева, а вось яго праўнук Дзмітрый Андрэевіч Дастаеўскі ў 2007 годзе наведаў радзіму продкаў.

**Заданне 7.**

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| | |
|---|---|
| 1. Здароў, марозны звонкі вечар, здароў, скрыпучы, мяккі снег!<br>2. Люблю цябе, мой бераг родны, | № 3 – у першых двух адасаюляюцца звароткі, а у трэцім – пабочнае слова. |

| | |
|---|---|
| дзе льецца Нёман срэбназвонны.<br>3. Можа, яшчэ хто з іх прыйдзе дамоў, каб паглядзець на прасторы палёў | |
| 1. Хведзька, прысеўшы наўколенцы, штосьці зацікаўлена разглядаў у траве<br>2. Як мары, белыя бярозы пад сінявой начной стаяць.<br>3. Як тая рабіна, цвіла ў гэтае лета Ганна. | № 1 – у другім і трэцім выдзяляюцца пунктуацыйна параўнальныя звароты, а ў першым – адасобленая акалічнасць, выражаная дзеепрыслоўным словазлучэннем. |
| 1. Кончыўшы ўпоцемку малаціць, Васіль павесіў на шула цэп і выйшаў з гумна.<br>2. Пот мачыў цвёрдыя, двух колераў валасы, поўз на лоб, абпалены сонцам.<br>3. Уваткнуўшы канец касся ў мяккую зямлю, Васіль стаў мянташыць. | № 2 – у першым і трэцім выдзяляюцца пунктуацыйна адасобленыя акалічнасці, а ў другім – адасобленае азначэнне. |

**Заданне 8.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Значэнне фразеалагізма** | **Фразеалагізм** |
|---|---|
| спрытна, хітра ашукаць, падмануць | прадаць і грошы палічыць, абуваць у лапці |
| пустасловіць, гаварыць упустую | пераліваць з пустога ў парожняе, плесці кашалі з лапцямі |
| вельмі (празмерна) хутка | на злом галавы, як з ланцуга сарваўшыся |
| вельмі многа | хоць вазамі вазі, па самую завязку |
| вельмі мала | на макавае зерне, капля ў моры |

**Заданне 9.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| **Інфармацыя пра твор** | **Назва твора** | **Аўтар** | **Жанр** |
|---|---|---|---|
| Твор выразна дзеліцца на дзве супрацьлеглыя часткі і своеасаблівае падагульненне, вывад. З першых слоў у творы непрымірыма сутыкнулася сваё, роднае з чужым, панскім. | ***“Слуцкія ткачыхі”*** | Максім Багдановіч | ***Верш*** |
| У гэтым творы, выкарыстоўваючы алегорыю, | ***“Дыпламаваны баран”*** | ***Кандрат Крапіва*** | Байка |

| | | | |
|---|---|---|---|
| аўтар вельмі ўдала апісвае пэўныя заганы (невуцтва, ганарлівасці, разумовую абмежаванасць, упартасць) чалавека, якога ў народзе часта называюць бараном. | | | |
| Уся аповесць складаецца з "біяграфій" персанажаў, узятыху агульную рамку вайны, блізкага бою, чакання немінучай пагібелі. Гэта "рамка" якраз і надае значнасць усяму, што калісьці было з чалавекам і што ёсць, выяўляючы вялікае або нікчэмнае ў ім. | ***"Жураўліны крык"*** | ***Васіль Быкаў*** | Аповесць |
| У творы праз сутыкненне гусляра і князя паказваецца сіла і непадкупнасць народнага мастацтва | ***"Курган"*** | Янка Купала | ***Паэма*** |
| Вуліца сучаснай неперспектыўнай вёскі. Хата, яе фасад. Пад вокнамі лавачка. Злева, каля плота, стары рыпучы журавель. На адным яго канцы ледзь пагойдваецца абшарпанае драўлянае вядро, на другім – груз. | ***"Вечар"*** | ***Аляксей Дудараў*** | Драма |

**Заданне 10.**

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | [1]**П** | Е | Й | З | А | Ж |
| [2]М | А | Н | **А** | Л | О | Г | | |
| [3]В | Е | Р | **Ш** | | | | | |
| | [4]Р | Э | **К** | В | І | Е | М | |
| | | [5]Г | **Е** | Р | О | Й | | |
| [6]С | І | М | **В** | А | Л | | | |
| | [7]Э | П | **І** | Т | Э | Т | | |
| | [8]З | А | **Ч** | Ы | Н | | | |

Псеўданім – Цётка (0,5 б), твор, які разглядалі ў VII класе "Шануйце роднае слова!" – (0,5 б )